А. В. ДАВІДОВІЧ

# ГРАМАДЗЯНСКІ І ТВОРЧЫ ЛЁС З. Х. ЖЫЛУНОВІЧА Ў КАНТЭКСЦЕ ТАТАЛІТАРНАГА СКАЖЭННЯ НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ПАЛІТЫКІ (канец 20 — сярэдзіна 30-х гадоў)

Імя першага старшыні ўрада Беларусі, аднаго з самых таленавітых сыноў беларускага народа, прафесійнага рэвалюцыянера і дзяржаўнага дзеяча, акадэміка, пісьменніка і журналіста З. Х. Жылуновіча (Цішкі Гартнага, 1887—1937) быццам бы даўно ўжо не замоўчваецца. Аднак сапраўдная рэабілітацыя яго як палітычнага дзеяча адбылася зусім нядаўна. Яна патрабуе адэкватна ацаніць тэарэтычную спадчыну і грамадскую дзейнасць гэтага энтузіяста нацыянальнага адраджэння Беларусі 20-гадоў.

Дзяржаўнае становішча краіны напрыканцы 20 — сярэдзіны 30-х гадоў характарызавалася згортваннем нэпа, пачаткам стварэння культа асобы Сталіна, завяршэннем працэсу зрошчвання партыйнага і дзяржаўнага апаратаў, што вяло да бюракратызацыі партыі і дэфармацыі сацыялізму па ўсіх напрамках.

Пасля смерці У. Леніна І. Сталін разгарнуў шалёную барацьбу са сваімі паплечнікамі за адзінаўладдзе. Дзеля гэтага ён высоўвае лозунг аб абвастрэнні класавай барацьбы ва ўмовах наступлення сацыялізму. Практычнае ажыццяўленне гэтага лозунга пачалося з масавага вышуквання і шальмавання класавых ворагаў, «левых» і «правых» апазіцыянераў, апартуністаў, нацыяналістаў. Менавіта ў гэтыя гады пачалося ганебнае цкаванне найбольш папулярнай беларускай навуковай і творчай інтэлігенцыі і перш за ўсё тых, хто актыўна прапагандаваў і ўзбагачаў мову, культуру, гісторыю свайго народа. Іх пачалі абвінавачваць у буржуазным нацыяналізме. Хутка гэтая брудная хваля накрыла і З. Х. Жылуновіча.

Са зменай акцэнтаў у нацыянальным будаўніцтве змяніліся і адносіны да аднаго з самых актыўных дзеячаў беларускага нацыянальна-вызваленчага руху. Усё пачалося з надуманых, у большасці фальсіфікаваных, абвінавачванняў. Так, у ходзе чысткі партыі (ліпень 1924 г.) праверачная камісія Наркамасветы БССР выключыла на адзін год З. Х. Жылуновіча з радоў РКП(б)Б «...за адарванасць ад мас і абывацельскую псыхалёгію». «Адарванасць ад мас» угледзелі ў тым, што на пытанне праверачнай камісіі: «Ці адчувае Жылуновіч сувязь з масамі?» ён адказаў, што адчувае сябе звязаным па роду сваёй працы, але разам з тым дадаў, што «...ён больш мае дачыненьне да мас беларускай інтэлігенцыі». Абвінавачванне ў «абывацельскай псыхалёгіі» вынеслі на той падставе, што адзначэнне пятнаццацігадовага юбілею яго творчасці завяршылася банкетам [1].

Па апеляцыі Жылуновіча ЦКК КП(б)Б 21 ліпеня 1924 г. перагледзела рашэнне праверачнай камісіі і скараціла тэрмін выключэння да 6 месяцаў. Пры гэтым Зміцеру Хвёдаравічу было рэкамендавана «...звязацца з рабочай масай, зжыць мяшчанскія тэндэнцыі. Адваротны прыём у партыю — праз рабочую ячэйку» [2]. Пасля яго паўторнай апеляцыі ЦКК КП(б)Б 27 верасня 1924 г. перагледзела ранейшую пастанову і вырашыла Жылуновіча З. Х. «...аднавіць у правах члена партыі, аб'явіўшы яму строгую вымову за невытрыманасць» [3].

У канцы 20-х гадоў ідэя дыктатуры пралетарыяту пачала перарастаць у дыктатуру Сталіна, паступова ажыццяўлялася згортванне ўсялякіх форм дэмакратыі. Сталінскі падыход да пытанняў нацыянальна-культурнага будаўніцтва, з уласцівым яму недаверам да любога праяўлення нацыянальнай свядомасці, стаў адчувацца і ў рэспубліцы. З. Х. Жылуновіч як чалавек мыслячы, хварэючы за справу нацыянальнага адраджэння Беларусі, даваў шмат падстаў для прадузятай і недарэчнай крытыкі яго дзеянняў і выказванняў.

У 1928 г., з'яўляючыся загадчыкам Галоўмастацтва Наркамасветы БССР, ён падтрымаў пункт гледжання Тодара Глыбоцкага (А. Дудара) у тэатральнай дыскусіі. Той патрабаваў павялічыць у рэпертуары тэатраў рэспублікі колькасць беларускамоўных твораў. У артыкуле «Беларуская самабытнасць і бязухільны інтэрнацыяналізм, ці старая пагудка на новы лад» З. Х. Жылуновіч развіў думку Т. Глыбоцкага і выступіў супраць перакладу на беларускую мову некалькіх савецкіх п'ес, якія ўжо прайшлі на сцэнах рускіх тэатраў і былі вядомы гледачу: «Бранепоезд 14—69», «Мяцеж», «Разлом» і г. д.

Тады, калі дазвалялася выказваць свае меркаванні толькі з аглядкай на Маскву, яго выступленне было кваліфікавана пастановай Бюро ЦК КП(б)Б (снежань 1928) як «палітычная памылка». У вынесенай вымове адзначалася, што ён «не стаў на абарону лініі партыі ў культурным будаўніцтве...» і «не

адмежаваўся ад шкодных палітычных установак Глыбоцкага». У той жа абсурдны час ЦК КП(б)Б прымае рашэнне адзначыць дваццацігадовы юбілей творчай дзейнасці З. Х. Жылуновіча (Цішкі Гартнага). Народнаму камісару асветы А. Баліцкаму было даручана ў сувязі з гэтым выступіць на вечары святкавання з прамовай аб літаратурнай творчасці Ц. Гартнага і адзначыць «адначасна... яго апошнюю памылку, звязаную з дыскусіяй аб тэатрах» [4]. Але тады аўтарытэт З. Х. Жылуновіча як грамадскага і дзяржаўнага дзеяча быў такі высокі, што яго палітычная надзейнасць пад сумненне не ставілася.

На першапачатковым этапе згортвання дэмакратыі нацыянал-дэмакратызм успрымаўся партуладамі як «правая» небяспека ў правядзенні культурнай рэвалюцыі, як «...тэндэнцыя ставіць нацыянальныя інтарэсы вышэй класавых, што... выявілася ў імкненні вырошчваць нацыянальную форму культуры на шкоду яе пралетарскаму зместу...» [5] У такіх абставінах 11 верасня 1929 г. на пасяджэнні Бюро ЦК КП(б)Б З. Х. Жылуновіч быў вызвалены ад пасады намесніка наркама адукацыі і загадчыка Галоўмастацтва. А праз пяць дзён Парттройка ЦКК КП(б)Б абвясціла яму вымову за «няўважлівыя адносіны і несур'ёзны падыход пры абгаворванні кандыдатур, прадстаўленых да ўзнагароджання ордэнам Працоўнага Сцягу» [6].

Асноўнай умовай існавання інтэлігенцыі становіцца гатоўнасць выканаць «сацыяльны заказ» улад. Было абвешчана аб недапушчальнасці несанкцыяніраваных творчых шуканняў і «ідэялагічнага легкадумства». Натуральна, Жылуновіч як значны грамадскі і нацыянальны дзеяч адным з першых пападае пад агонь крытыкі. 13 лістапада 1929 г. камісія па праверцы і чыстцы складу ячэйкі КП(б)Б Наркамасветы выключыла яго з партыі «...за сістэматычныя выказванні поглядаў, аб'ектыўна накіраваных супраць партыі і сацыялістычнага будаўніцтва, бюракратызм і адарванасць ад партжыцця». У гэтым пратаколе абвінавачванні Жылуновіча ўпершыню мелі даволі сістэматызаваны і стройны выгляд. У віну яму, па-першае, ставілася тое, што на працягу апошніх год у сваёй палітычнай і літаратурнай дзейнасці выказваў погляды, якія ідэалізавалі беларускі нацыянальны рух дакастрычніцкай эпохі. Так, у артыкуле «Дваццаць год назад (успаміны з мінулага)» ён ахарактарызаваў «фашыста і страшэннага ворага Савецкай Беларусі» А. Луцкевіча як рэвалюцыянера і барацьбіта за вызваленне беларускага народа. Па-другое, у нарысе «Беларускія сэкцыі РКП(б) і стварэнне Беларускай Савецкай рэспублікі» на першае месца высоўваў не КП(б)Б, а беларускія камуністычныя секцыі, стваральнікам якіх ён сам і з'яўляўся. Па-трэцяе, у апавяданні «Здарэнне з камісарамі» выказаў «паклёпніцкі погляд на кіруючыя кадры...», уклаў у вусны дзеючых асоб — камісараў «меньшавіцкі-пасквільную ацэнку сутнасьці індустрыялізацыі... планавасьці савецкае гаспадаркі і, наогул, сацыялістычнага будаўніцтва». Па-чацвёртае, пры правядзенні першай акадэмічнай канферэнцыі лінгвістаў (1926) выступіў з прапановай аб увядзенні лацінскага алфавіту ў беларускую мову. Камісія ацаніла гэты факт «як палітычны акт... які з'ўляецца арыентацыяй на Польшчу, і накіраваны супраць культурнае сувязі працоўных БССР з народамі Савецкага Саюзу».

Па-пятае, з'яўляючыся рэдактарам часопіса «Полымя», змяшчаў творы аўтараў «... з палітычна-шкодніцкімі поглядамі, што вызвала ацэнку часопісу як воргану, у якім адбіваліся нацыянал-дэмакратычныя погляды». Па-шостае, працуючы ў Наркамасвеце, не вёў барацьбы з «палітычнымі памылкамі» у камісарыяце, якія кваліфікаваліся як «... правы ўхіл у культурна-нацыянальным будаўніцтве...» У віну яму ставілася і тое, што ён здзяйсняў «палітрэдагаванне і папярэднюю ацэнку... палітычна-шкоднай... кнігі Л. Клейнбарта «Маладая Беларусь», што ў час партыйнай чысткі, замест таго, каб «...па-бальшавіцку прызнаць свае буйнейшыя нацыянал-дэмакратычныя памылкі, ён імкнуўся замазаць іх, тлумачачы выпадковасцю...» Ужываючы скажонае тлумачэнне тэзісаў з некаторых публікацый і выступленняў З. Х. Жылуновіча, камісія зрабіла перабольшаны вывад аб тым, што памылкі яго ператварыліся ў сістэму, і ён «...праводзіў сваю палітычную лінію, асобную ад генеральнай лініі партыі і імкнуўся супрацьставіць яе партыйнай...» [7].

Вядома, што ў паасобныя моманты вострай і складанай палітычнай барацьбы і сацыяльных пераўтварэнняў З. Х. Жылуновіч дапускаў сумненні і хістанні. З'яўляючыся ўдзельнікам большасці паслякастрычніцкіх падзей у рэспубліцы, ён, натуральна, меў усе падставы для свайго пункту гледжання і асабістай ацэнкі стану сацыяльнага і нацыянальнага адраджэння Беларусі. Аднак яго погляды нярэдка супярэчылі афіцыйнай версіі тлумачэння той або іншай гістарычнай падзеі. Усе гэтыя «няправільна расстаўленыя акцэнты» у далейшым трагічным чынам адбіліся на яго лёсе.

Пасля выключэння з радоў партыі 22 лістапада 1929 г. З. Х. Жылуновіч піша

ліст у Мінскую акруговую кантрольную камісію КП(б)Б, у якім «сцвярджае сваё рашучае і поўнае прызнанне...» усіх памылак і просіць аднавіць яго ў партыі, каб мець «магчымасць... на справе выправіць іх» [8]. 13 снежня ён падае заяву ў ЦКК КП(б)Б, якая 21 снежня як паказальны акт раскайвання была надрукавана газетай «Рабочий» у выглядзе артыкула «Мае памылкі і іх карані». Прызнаючы, што яго памылкі выкарысталі нацыянал-дэмакраты ў сваіх мэтах, ён, як і раней, прасіў не выключыць яго з партыі, каб мець магчымасць выправіцца.

Прэзідыум Мінскай акруговай кантрольнай камісіі, разгледзеўшы ліст Жылуновіча 14 студзеня 1930 г., прызнаў пастанову аб выключэнні яго з партыі правільнай. Аднак з улікам таго, «што прызнаўшы свае нацыянал-дэмакратычныя памылкі як сістэму поглядаў, накіраваных супраць партыі... надрукаваўшы артыкул «Мае памылкі і іх карані»... ён зрабіў першы крок да барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам», прэзідыум рашыў Жылуновіча ў партыі пакінуць і аб'явіць яму «за ідэалёгічныя хістанні суровую вымову з папярэджаннем» [9].

Аднак усе гэтыя цяжкія для Зміцера Хвёдаравіча прызнанні дапамаглі мала. Супраць яго разгортваецца сапраўдная кампанія ачарнення і цкавання, пачатая яшчэ кастрычніцкім (1930) пленумам ЦК КП(б)Б, дзе разам з Жылуновічам галоўнымі абвінавачванымі былі У. Ігнатоўскі, А. Адамовіч і інш. 16 студзеня 1931 г. Прэзідыум ЦКК КП(б)Б пастанавіў выключыць Жылуновіча з партыі за «сознательное проведение национал-оппортунистической и национал-демократической линии, за участие в антипартийных группировках, за связь с чуждыми... делу пролетариата национал-демократическими и фашистскими элементами и как являющегося рупором враждебных сил, который использовала в своих целях национал-демократическая контрреволюция в борьбе с диктатурой пролетариата» [10].

30 студзеня 1931 г. З. Х. Жылуновіч, не зразуметы ў рэспубліцы, звярнуўся з лістом у ЦКК ВКП(б). У ім ён апісаў свой жыццёвы шлях і падкрэсліў, што ўжо стаў «на твердый большевистский путь борьбы за генеральную линию партии», таму прасіў аднаўлення ў яе радах. Калі чытаеш гэтае і ўсе астатнія пісьмы-споведзі З. Х. Жылуновіча, адчуваеш, што іх пісаў ужо маральна і фізічна зломлены, дэмаралізаваны чалавек. Гэта і зразумела, бо сталінская машына рэпрэсій не толькі пазбаўляла жыцця, яна духоўна спустошвала людзей, калечыла іх лёсы.

15 сакавіка 1931 г. Прэзідыум ЦКК ВКП(б) паведаміў, што ён пацвярджае пастанову ЦКК КП(б)Б ад 16 студзеня, але прымаючы пад увагу заяву «аб прызнанні сваіх памылак і дадатную характарыстыку, якая была дадзена парткалектывам завода «Камунар», лічыць магчымым перагледзець гэту пастанову праз год» [11].

Адчуваючы, што вакол згушчаюцца хмары, Жылуновіч робіць яшчэ адну спробу рэабілітаваць сябе. У 1931 г. для першага нумара часопіса «Камуністычнае выхаванне» ён падрыхтаваў артыкул «Нацыянал-дэмакраты за «працай» і перадаў яго свайму нядобразычліўцу, рэдактару часопіса Л. Бэндэ. Зрабіўшы некалькі заўваг, Бэндэ надрукаваў артыкул. Але адначасова ён ад імя рэдакцыі накіраваў у газету «Савецкая Беларусь» ліст (надрукаваны 16 красавіка), у якім сцвярджаў, што Жылуновіч толькі робіць выгляд, што прызнае нацыянал-дэмакратычную сутнасць сваёй канцэпцыі гісторыі рэвалюцыі Беларусі, а таксама асуджае сваю антыпартыйную працу. «На самой жа справе, — гаварылася ў лісце, — ён абараняўся рознага роду змякчальнымі фармуліроўкамі» [12].

Калі Жылуновіч азнаёміўся з гэтым па сутнасці даносам, ён напісаў заяву ў ЦКК ЦК(б)Б, у якой паведаміў пра абставіны падрыхтоўкі і ідэйную накіраванасць артыкула, растлумачыўшы, што Бэндэ ў апошні час заняўся ўзвядзеннем паклёпу і злоснага цкавання яго як пісьменніка і чалавека. Старшыня ЦКК А. Я. Калпін на заяву З. Х. Жылуновіча налажыў рэзалюцыю: «...Тут трэба добра разабрацца. Крытыкаваць можна і трэба памылкі, але не шэльмаваць, калі гэта няпраўда» [13]. Пасля добрасумленнай праверкі заявы Жылуновіча Цэнтральная кантрольная камісія выступіла ў газеце «Звязда» 19 красавіка з артыкулам «Недапушчальны перагіб», у якім абнародавала свой вывад: нягледзячы на тое, што Жылуновіч «робіць першыя спробы самакрытычнага аналіза сваёй мінулай дзейнасці... рэдакцыя часопіса «Камуністычнае выхаванне» пайшла па лініі «цкавання, а не дапамогі яму» [14].

Аднак атмасфера пошуку «ворагаў народа» хутка напальвалася. Калі першапачаткова нацыянал-дэмакратызм трактаваўся як правая небяспека ў культурным будаўніцтве, то неўзабаве ён стаў абвінавачвацца ў контррэвалюцыйнасці. У гэтых абставінах З. Х. Жылуновіч аўтаматычна разам з вялікай колькасцю нацыянальных дзеячаў апынуўся ў лагеры «ворагаў народа». Пытанне аб аднаўленні яго ў радах партыі, нягледзячы на рашэнне Прэзідыума ЦКК ВКП(б)

ад 15 сакавіка 1931 г., больш не разглядалася. У гэты час да яго віны дабавіліся новыя абцяжарваючыя абставіны. З. Жылуновіч абвінавачваецца па справах «Саюза адраджэння Беларусі» (САБ), «Саюза вызвалення Беларусі» (СВБ), «Беларускага нацыянальнага цэнтра» (БНЦ). Галоўнай мэтай гэтых «контррэвалюцыйных фашысцкіх падпольных цэнтраў» было вяртанне БНР шляхам ваеннай інтэрвенцыі. Абвінавачванні былі фальсіфікаваны «паказаннямі» В. Ластоўскага, І. Дварчаніна, Я. Лёсіка, П. Мятлы і інш. У гэты час яны знаходзіліся пад следствам у НКУС, а якімі «метадамі» дабіваліся там «паказанні» зараз вядома. Ні тады, ні пасля прамых доказаў віны З. Х. Жылуновіча не было. Гэта не пашкодзіла старшыні ДПУ БССР Рапапорту заявіць на кастрычніцкім (1936) пленуме ЦК КП(б)Б: «...Мы лічым яго (Жылуновіча — А. Д.) закончаным нацдэмам, на 100 % дапамагаючым ім у працы» [15].

Усіх гэтых абвінавачванняў хапіла, каб 15 лістапада 1936 г. З. Х. Жылуновіч быў арыштаваны НКУС. Не вытрымаўшы здзекаў на допытах, ён памёр 11 красавіка 1937 г. у Магілёўскай псіхіятрычнай бальніцы.

Так сталінская таталітарная сістэма расправілася з адным з самых значных дзеячаў нацыянальнага адраджэння беларускага народа. Больш чым паўстагоддзя мінула са дня смерці З. Х. Жылуновіча, але толькі цяпер усведамляецца намі ва ўсёй глыбіні яго трагічны лёс, з усімі ўзлётамі, памылкамі і сумненнямі.

[1] НАРБ. Ф. 15, воп. 22, спр. 14, арк. 68.
[2] Там жа. Спр. 13, арк. 17.
[3] Там жа. Спр. 10, арк. 53; ф. 15, воп. 3, спр. 1031, арк. 107.
[4] НАРБ. Ф. 4, воп. 3, спр. 31, арк. 300—301; 173.
[5] Майзель Ю., Шапавалаў М. Кароткі нарыс гісторыі КП(б)Б. Мн., 1929. С. 4.
[6] НАРБ. Ф. 15, воп. 3, спр. 1031, арк. 100.
[7] Там жа. Арк. 1.
[8] Там жа. Арк. 2.
[9] Там жа. Арк. 92—99; 107.
[10] Там жа. Воп. 28, спр. 10, арк. 3.
[11] НАРБ. Ф. 4, воп. 21, спр. 220, арк. 116.
[12] Савецкая Беларусь. 1931. 16 красавіка.
[13] НАРБ. Ф. 15, воп. 5, спр. 85, арк. 3; 1.
[14] Там жа. Воп. 28, спр. 10, арк 3.
[15] НАРБ. Ф. 4, воп. 20, спр. 75, арк. 259.

А. І. ХОЦІНА

## ДА ПЫТАННЯ АБ КАНЦЭПЦЫІ НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНАГА БУДАЎНІЦТВА Ў 20—30-Я ГАДЫ

Кастрычнік 1917 г. лічыцца пачаткам новага перыяду айчыннай гісторыі, хаця вынікі палітычнага перавароту не адразу адбіліся на культурным жыцці грамадства. Адметнай асаблівасцю гэтага перыяду з'яўляецца ўзмацненне кіруючага ўздзеяння партыі на культурнае будаўніцтва, якое ажыццяўлялася праз сістэму дзяржаўных і грамадскіх устаноў у духу марксісцка-ленінскай ідэалогіі. Найбольш пільную ўвагу гісторыкаў у гэтым плане прыцягваюць культурныя падзеі 20—30-х гадоў, якія некаторыя даследчыкі супрацьпастаўляюць як часы ліберальнай ленінскай палітыкі і аўтарытарнай сталінскай. Але дастаткова прыгадаць словы Леніна на VIII з'ездзе РСДРП(б) аб тым, што «няма такіх форм навукі і мастацтва, якія б не былі звязаны з вялікімі ідэямі камунізма» [1] (Крупская сфармулявала гэта больш вобразна: «трэба стварыць з мастацтва свайго роду рэзанатар, узмацняючы ўсё камуністычнае» [2]), і ленінскі падзел культур на буржуазную і пралетарскую — фактычнае адмаўленне паняцця «нацыянальная культура» і высоўванне на першы план ідэалагічнага зместу.

Безумоўна, у развіцці савецкай культуры можна выдзеліць дзве тэндэнцыі: творча-дэмакратычную і аўтарытарную. Узніклі яны і праяўляліся адначасова, але галоўную ролю заўжды іграла аўтарытарная тэндэнцыя, якая сілкавалася палітыкай партыі. Выключэннем можна лічыць толькі перыяд з 1921 па 1930 г., калі НЭП як вымушаная ўступка з боку партыі садзейнічала лібералізацыі гаспадарчага жыцця і развіццю культуры на нацыянальнай глебе. Так, у рэзалюцыі X з'езда партыі, напісанай Леніным, чытаем: «Гаспадарчыя ўстановы, установы